мелі тыповы змест. У іх абавязкова пазначаліся імены і прозвішчы [illegible] пасведчанне было выдадзена, месца, куды кіруюцца перасяленцы, а таксама часовыя рамкі, у якія патрэбна здзейсніць міграцыю[1].

Дадзеныя інструкцыі давалі перасяленцам яснае ўяўленне, якія пры ім мусяць быць дакументы, каму неабходна перадаць праходнае пасведчанне, як набыць праязны білет па ільготным тарыфе і па якім маршруце перасяленцы павінны перамяшчацца да кропкі прызначэння. Аналіз інструкцый дае ўяўленне аб умовах перасялення, самой працэдуры міграцыі, перасяленчых тарыфах і тых цяжкасцях, з якімі сутыкаліся ўнутраныя мігранты падчас перасялення, а таксама тымі мерамі, якія прымалі ўлады імперыі дзеля забеспячэння санітарна-харчовай бяспекі перасяленцаў. Так, на перасяленчых маршрутах у межах Сібіры дзейнічала арганізаваная МУС сістэма дапамогі перасяленцам, якая ўключала ў сябе «*становища и врачебно-питательные пункты по грунтовым дорогам, в коих переселенцы смогут пользоваться приютом, медицинской помощью и, за умеренную плату горячей пищею, а также летние санитарные отряды для сопровождения переселенческих партий, следующих водным путями*»[2].

Поўную карціну працэдуры перасялення можна ўбачыць, аналізуючы ў тым ліку датычныя міграцыі дакументы на кропках уваходу. Аднак даследаванне праблемы перасяленняў на кропках выхаду мігрантаў дапамагае зразумець прычыны працоўнай міграцыі, даць ацэнку эфектыўнасці дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі і больш глыбока асэнсаваць наступствы мадэрнізацыйных працэсаў у беларуска-літоўскіх губернях у другой палове XIX – пачатку XX ст.

**С. В. Мяньчэня** *(Мінск, Беларусь)*

## ПРОДАЖ І СПАЖЫВАННЕ ГАРЭЛКІ Ў МСЦІСЛАВЕ Ў 1904–1905 гг.

Лічыцца, што на ўзровень продажу і спажывання алкагольных напояў вялікі ўплыў аказваюць розныя фактары: палітычная сітуацыя, культурныя традыцыі, колькасць пунктаў продажу і кошт алкаголя. Наколькі справядлівы гэты тэзіс дазваляюць адказаць статыстычныя крыніцы.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захаваліся дадзеныя Акцызнага ўпраўлення па продажы гарэлкі ў Мсціслаўлі за 1904–1905 гг. У якасці сістэмы вымярэння колькасці гарэлкі выкарыстоўваецца тагачасная – вёдзерная сістэма (1 вядро = 12,3 л) (табл. 1).

Сетка продажу гарэлкі ў Мсціслаўлі ў 1904 г. была прадстаўлена 2 «казёнымі віннымі крамамі» і 2 корчмамі. «Казённыя вінныя крамы» ажыццяўлялі вынасны гандаль, і ў народзе атрымалі назву манапольки. Паводле дзяржаўнай

---

[1] НГАБ. Ф. 242. Воп. 1. Адз. зах. 2636. Арк. 59–60.

[2] Тамсама. Арк. 60.

*Табліца 1.* **Продаж гарэлкі ў Мсціслаўлі ў 1904–1905 гг.**[1]

| Год | 1904 | | | 1905 | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Месяцы продажу | 2 манапалькі | 2 карчмы | Разам | 2 манапалькі | 1 карчма | Разам |
| Студзень | 830,85375 | 222 | 1052,85375 | 594,80875 | 98,5 | 693,30875 |
| Люты | 631,3425 | 183,5 | 814,8425 | 749,802 | 109,5 | 859,302 |
| Сакавік | 514,83625 | 138 | 652,83625 | 491,6495 | 83 | 574,6495 |
| Красавік | 594,45875 | 166,5 | 760,95875 | 619,17375 | 71 | 690,17375 |
| Май | 672,22125 | 199,7 | 871,92125 | 644,78425 | 93,5 | 738,28425 |
| Чэрвень | 502,2425 | 166,4875 | 668,73 | 684,201 | 97,5 | 781,701 |
| Ліпень | 468,96375 | 171,2 | 640,16375 | 629,952 | 88 | 708,952 |
| Жнівень | 542,6375 | 185,7625 | 728,4 | 699,82925 | 109 | 808,82925 |
| Верасень | 602,875 | 200,475 | 803,35 | 640,0895 | 112,5 | 752,5895 |
| Кастрычнік | 827,165 | 85,0625 | 912,2275 | 781,7605 | 63,5 | 845,2605 |
| Лістапад | 513,2375 | 156,7875 | 670,025 | 594,988 | 91 | 685,988 |
| Снежань | 835,30625 | 108,5 | 943,80625 | 1031,983 | 115 | 1146,983 |
| За год | 7536,16 | 1988,675 | 9522,115 | 8154,0245 | 1135 | 9286,0215 |
| Даход у руб. | 58145,805 | 15316,185 | 73462,035 | 65488,765 | 9056 | 74544,765 |

віннай манаполіі, распаўсюджанай на тэрыторыю беларуска-літоўскіх губерняў у 1897 г. дзяржава вызначала кошт гарэлкі, а таксама сачыла за яе якасцю. Гарэлачная этыкетка прадстаўляла сабой назву «Казённае віно» з дзяржаўным гербам, з вызначэннем моцнасці, памеру тары і кошту. Разліў гарэлкі прадугледжваўся ў бутэлькі аб'ёмам 1/4, 1/20, 1/40, 1/100 і 1/200 вядра. «Казённае віно» існавала ў некалькіх варыянтах – віно звычайнае («чырвонагалоўка» – ад колеру корка) і віно сталовае, двайной ачысткі («белагалоўка») моцнасцю ў 40°. У паўднёвых, паўднёва-заходніх, паўночна-заходніх (беларуска-літоўскіх) і прывіслінскіх губернях выраблялася «казённае віно» моцнасцю 57°[2]. Корчмы ва ўмовах манаполіі атрымлівалі патэнты на продаж гарэлкі па вызначаным дзяржавай кошце для спажывання на месцы (на разліў).

Продаж алкагольных напояў жорстка рэгламентаваўся па часе. У гарадах манапалькі павінны былі працаваць з 7 да 22 гадзін. У нядзелю і ў святочныя дні продаж ажыццяўляўся толькі пасля завяршэння літургіі да 20, а ў зімовы час да 18 гадзін. Цалкам забараняўся продаж на Страсны тыдзень, першы дзень Вялікадня і Нараджэння Хрыстова, на час мабілізацыі, калі крама знаходзілася паблізу прызыўнога ўчастка.

З увядзеннем дзяржаўнай віннай манаполіі ў структуры продажу алкагольных напояў стаў дамінаваць вынасны гандаль. Вялікая ўвага надавалася арганізацыі манаполек, іх знешняму выгляду, падбору персанала. Асобна вызначаўся інтэр'ер і правілы паводзін у казённых крамах. Тут павінна было быць чыста, на сценах знаходзіліся гадзіннік, абраз і правілы паводзінаў. Вывеш-

---

[1] НГАБ. Ф. 2162. Воп. 1. Адз. зах. 46. Арк. 36 адв. – 37, 180 адв. – 181.

[2] Казённая продажа вина / издание Главного Управления Неокладных сборов и казённой продажи питей. Санкт-Петербург, 1900. С. 36.

ванне карцін і партрэтаў, у тым ліку манаршых асоб, забаранялася. Пакупнікі пры ўваходзе павінны былі здымаць галаўныя ўборы (дадзеная мера была адменена Міністэрствам фінансаў ў лістападзе 1905 г.), паводзіць сабе прыстойна, не курыць, не адчыняць і не піць набытую гарэлку, і не затрымлівацца больш часу, чым неабходна для здзяйснення пакупкі[1].

Пры роўнай колькасці манаполек і корчмаў у 1904 г. у Мсціслаўлі на долю апошніх прыходзіўся прыблізна 21 % ад памеру рэалізаванай гарэлкі і столькі ж ад агульнай сумы прыбытку. У 1905 г. 1 карчма была зачынена, што паўплывала на павелічэнне попыту другой установы (з сярэдняга паказчыка 994 вядра ў папярэднім годзе да 1135), але пры гэтым доля разлівачнага гандлю скарацілася да 12 %. Такая сістэма ўплывала на культуру спажывання алкагольных напояў – пашыраліся выпадкі вулічнага п'янства, алкаголь рабіўся больш даступным для жанчын, падлеткаў і дзяцей.

Для Расійскай Імперыі перыяд 1904–1905 гг. быў часам цяжкіх выпрабаванняў – у лютым 1904 г. пачалася вайна з Японіяй, у студзені 1905 г. – рэвалюцыя. Ці паўплывалі гэтыя падзеі на ўзровень спажывання алкагольных напояў?

Для параўнання возьмем лічбы за «неэкстрымальны» перыяд, у прыватнасці за 1912 г. Што датычыцца дынамікі продажу на працягу года, то ў цэлым па імперыі, так і па беларускім губерням яна вызначалася наступнымі фактарамі – змяншэнне спажывання ў час пастоў і летняга перыяду гаспадарчых работ. Рост спажывання прыходзіўся на перыяд свят – калядны і велікодны тыдні, а таксама на апошні квартал года, калі адбывалася рэалізацыя ўраджая[2]. Асобна трэба адзначыць кастрычнік, пры дастаткова вялікіх лічбах спажывання, гэта час найменшай прыбытковасці корчмаў. Такое становішча можна растлумачыць тым, што ў традыцыйнай культуры гэта перыяд вяселляў. Падобная дынаміка прасочваецца і за 1904–1905 гг. Скарачэнне на 1/3 продажу ў студзені 1905 г. у параўнанні з адпаведным паказчыкам 1904 г. можна патлумачыць палітычнымі падзеямі (Крывавыя нядзеля і пачатак рэвалюцыі), падзенні назіралася і ў кастрычніку (Усерасійская палітычная стачка, абвяшчэнне Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г.). Але разам з гэтым трэба мець на ўвазе, што ў студзені 1905 г. для кампенсацыі расходаў на вядзенне вайны з Японіяй урад павысіў цэны на гарэлку[3]. Рост склаў +40 кап. за вядро, што дазволіла ўладам атрымаць прыбытак пры некаторым падзенні спажывання. Па Мсціслаўлі дадзены паказчык склаў 236 вёдзер і +1083 руб.

Першапачатковае падзенне спажывання (у студзені 1905 г. было рэалізавана на 35 % менш за адпаведны паказчык 1904 г.) было кампенсіравана ўжо ў лютым

---

[1] *Пашков Е. В.* Исторический опыт осуществления казенной винной монополии в России конца XIX – начала XX века // Известия Российского государственного педагогического университета им. А. И. Герцена. № 159. Санкт-Петербург, 2013. С. 19.

[2] Финансовый отчет по казенной винной операции за 1912 г.: составлен по отчетам губернских и областных акцизных управлений / Гл. упр. неоклад. сборов и казен. продажи питей. СПб., 1913. С. 8.

[3] *Беляев С. Г.* Барк П. Л. и финансовая политика России, 1914–1917 гг. СПб., 2002. С. 159.

1905 г. (рост +5 %). Больш гарэлкі, у параўнанні з папярэднім годам, было прададзена і падчас летніх месяцаў (+17 % у чэрвені, +11 % у ліпені і жніўні), а таксама ў лістападзе-снежні, таму агульнае падзенне склала ўсяго 2,5 %.

Значны рост спажывання прыходзіўся на дні кірмашоў. У гэты час у горад прыязджалі сяляне, корчмы атрымлівалі дадатковых наведвальнікаў, якія не толькі шукалі прытулку, але і дамаўляліся аб здзелках, ці адзначалі іх паспяховае завяршэнне. Мсціслаў мог пахваліцца 4 кірмашамі: на дзень Святой Троіцы, на Успенне Святой Багародзіцы (15 жніўня), «Зборніца» – на другі тыдзень Вялікага Паста і «Красны торг» – у апошні панядзелак перад Калядамі[1]. Наяўныя лічбы і інфармацыя не дазваляюць вызначыць наколькі гэты фактар спрацоўваў. Але, прынамсі, жнівень, на працягу гэтага перыяда, вылучаецца сярод іншых летніх месяцаў. «Зборніца» і «Красны торг» з прычыны іх правядзення ў перыяд пастоў, верагодна, істотна на ўзровень спажывання алкаголя не ўплывалі.

Захаваліся таксама лічбы, якія дазваляюць вызначыць, перавагі насельніцтва Мсціслаўшчыны у гатунках спіртных напояў і іх тары (табл. 2). Дадзеныя лічбы датычацца ўсяго павета.

Найбольшай папулярнасцю ў насельніцтва карысталася «чырвонагалоўка», «сталовае віно» пры той жа моцнасці адрознівалася ад звычайнага лепшай ачысткай і адпаведна коштам. Пераплочваць за гарэлку насельніцтва не жадала – на 65500,3 вядра звычайнай гарэлкі прыйшлося толькі 222,67 сталовай.

*Табліца 2.* **Продаж гарэлкі і спірта па Мсціслаўскім вінным складзе № 6 за 1905 г.[2]**

| Гатунак | Посуд | Колькасць вёдзер | Бутэлькі |
|---|---|---|---|
| Звычайнае віно 40° | 1/4 | 14135,50 | 56542 |
| | 1/20 | 24086,950 | 481739 |
| | 1/40 | 19974,025 | 798961 |
| | 1/100 | 6950,66 | 695066 |
| | 1/200 | 353,165 | 70633 |
| Сталовае віно 40° | 1/4 | 6,25 | 27 |
| | 1/20 | 121,05 | 2421 |
| | 1/40 | 73,8 | 2952 |
| | 1/100 | 21,57 | 2057 |
| | 1/200 | – | – |
| Спірт 57° | 1/4 | 2 | 8 |
| | 1/20 | 105,15 | 2108 |
| | 1/40 | 367,3 | 14692 |
| | 1/100 | 771,39 | 77139 |
| | 1/200 | 318,38 | 63678 |

[1] Памяць: Мсціслаўскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Мінск, 1999. С. 65.

[2] НГАБ. Ф. 2162. Воп. 1. Адз. зах. 46. Арк. 173.

Асноўнай тарай для гарэлкі выступалі бутэлькі ў 1/20 (≈ 615 г) і 1/40 (≈ 307 г) вядра. Папулярныя ў гарадскім працоўным асяроддзі «соткі» (1/100 вядра ≈ 120 г) і «кручкі» (1/200 вядра ≈ 60 г) з'яўляліся асноўнай тарай для гарэлкі ў 57° – 1089,77 вёдзер з 1564,22 (69,6 %), у той час як для звычайнай гарэлкі дадзены паказчык склаў 11 %, а для сталовага – 9,7 %. Большая моцнасць пры меншай тары спрыяла хутчэйшаму ап'яненню, часта «кручкі» выпівалі проста каля крамы, негледзячы на адміністрацыйную адказнасць за вулічнае п'янства.

Такім чынам, можна вылучыць наступныя тэндэнцыі ў спажыванні спіртных напояў жыхароў Мсціслаўшчыны ў пачатку ХХ ст., якія ў цэлым адпавядалі сітуацыі на ўсёй тэрыторыі Беларусі:

традыцыйна насельніцтва больш спажывала алкаголь ў перыяд свят, а таксама восенню, і менш ў летні перыяд і падчас пастоў. Часам, пад уплывам знешніх фактараў графік змяняўся, але не прынцыпова;

у структуры продажу пераважаў вынасны гандаль, змяншэнне колькасці пунктаў продажу ў кароткатэрміновай перспектыве на ўзровень спажывання амаль не ўплывала;

ва ўмовах дзяржаўнай манаполіі ўлада выкарыстоўвала рост кошту на гарэлку для «латання» бюджэту, таму пры росце дзяржаўных даходаў падзенне ўзроўня спажывання было несуадносным;

перавага вынаснога гандлю спіртнымі напоямі прывяла да фарміравання новых звычак у спажыванні алкаголя (вулічнае п'янства, адсутнасць закускі), якія і да гэтага часу прысутнічаюць у нашым грамадстве.

**В. Ф. Сосонкина, Е. А. Тарабарова** *(Минск, Мстиславль, Беларусь)*

## ЛЕКАРСТВЕННОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ НАСЕЛЕНИЯ И ЛЕЧЕБНЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ В МСТИСЛАВСКОМ КРАЕ В ПЕРИОД РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ

Жители Мстиславщины издавна использовали лекарственные растения для лечения многих заболеваний. Официально продажа товаров, в том числе лекарственных растений, разрешалась только в тех городах, которые обладали Магдебургским правом. Мстиславль получил такое право и герб («Малую погоню») в 1634 г. Торговля лечебными травами осуществлялась через «зелейные» лавки.

В XVII в. на территории Беларуси активно организовываются иезуитские костелы и коллегиумы, действовал коллегиум и в Мстиславле. В 1740 г. в Мстиславском иезуитском коллегиуме открыта аптека (аптекарь – иезуит Эймонд)[1]. Изначально она размещалась в деревянном доме иезуитской миссии, а после начала строительства каменного иезуитского костела, около середины XVIII в., иезуиты построили каменное здание аптеки[2].

---

[1] *Гринцевич В. П.* С факелом Гиппократа. Минск, 1987. С. 77.

[2] *Трусаў А. А.* Будаўнічая тэхніка мсціслаўскіх храмаў XVIII – пачатку XIX ст. // Мсціслаў і Мсціслаўскі край. Мінск, 2019. С. 234.